***К.А.Пратасевіч***

БДЭУ (Мінск)

# КІРЫЛА ТУРАУСКІ – ХРЫСЦІЯНСКІ АСВЕТНІК СЯРЭДНЯВЯКОВАЙ БЕЛАРУСІ

Кірыла Тураўскі (каля 1130-1182) – выдатны пісьменнік, палітычны дзеяч. Звестак пра яго жыццё няшмат. Падрабязнасці жыцця, такія, як дакладныя даты нараджэння і смерці, свецкае імя і г.д., невядомыя; непасрэдныя дакументальныя звесткі абмяжоўваюцца «Жыціем» і адзінай летапіснай згадкай (Іпацьеўскі летапіс, 1169). Магчыма, паходзіў з арыстакратычнай сям'і, а яго бацька служыў Святаполку II. У рукапісных пралогах захавалася яго «Жыціе». У ёй гаворыцца: «Гэты шчасны Кірыла нарадзіўся ў горадзе Тураве. Сын заможных бацькоў ён не любіў багацця і тленнай славы гэтага свету, але добра напрактыкаваўся ў Святых Пісаннях». Атрымаў добрае хатняе выхаванне, пазней спасціг вышэйшыя навукі і мастацтвы ад грэчаскіх настаўнікаў. Па-майстэрску валодаў народнай вобразнай і стараславянскай мовамі, глыбока ведаў візантыйскую культуру, асабліва паэзію і красамоўства. Рана стаў паслушнікам аднаго з манастыроў. Кірыла Тураўскі быў першым на Русі «стоўпнікам».

Адзначаецца добрая адукаванасць Кірыла, асабліва ў багаслоўі; ведаў мовы, у т.л. грэчаскую. Быў пастрыжаны ў манахі, магчыма, Нікольскага манастыра Турава (прыкладна, у канцы 1120-х-пач. 1130-х гг). Пасля пастаўлення на Рускую мітраполію Клімента Смаляціча (1147) і пачатку ўціску з боку «самастойнікаў» у бок «грэкафілаў», Кірыл, як прыхільнік апошніх, з канца 1147 - пач. 1148 або быў зняволены ў манастыры, або прыняў подзвіг стоўпніцтва, якое, аднак, мела выгляд самазачынення *ў* келлі (т.ч., у «стаўпе» (або вежы), а не на «стаўпе»). У гэты час займаўся каментаваннем Святога Пісання, і, відаць, паводле Антыяхійскай школы экзегетыкі (праца не захавалася). Пасля змянення палітычнай сітуацыі на карысць «візантыністаў» Кірыла быў пастаўлены на Тураўскае епіскапства тураўскім князем Юр'ем (прыкладна, каля 1159-1161, у час небыцця мітрапаліта на Русі, што, аднак,

было пэўным парушэннем кананічнасці). Актыўна ўдзельнічаў у палеміцы 2-й пал. 12 ст. вакол царкоўнага ўладкавання на землях Русі. Магчыма, што каля 1177 быў пазбаўлены пасады епіскапа, і, відаць, прымусова.

Каля 1169 г. князь Юрый Яраслававіч з тураўскімі старэйшынамі ўпрасілі Кірылу прыняць епіскапства. У гэты час Фёдар з Уладзіміра-Суздальскага княства, пры дапамозе князя Андрэя Багалюбскага, пачаў раскол праваслаўнай царквы на Русі. На гэта Кірыла пракляў яго, а да князя Андрэя напісаў шмат пасланняў па гэтай справе, якія не захаваліся. Але вобразы апошніх (Фёдара і Андрэя Багалюбскага) адбіліся у створанай Кірыла Тураўскім «Прытчы пра сляпога і кульгавага, або Пра чалавечаю душу і цела».

Ён лічыў, што палітычныя мэты не павінны дасягацца ашуканствам і злачынствам. Нельга беспакарана тварыць зло, рана ці позна яно будзе пакарана.

Кірыла Тураўскі быў пахаваны на Барысаглебскіх могілках Турава. Не выключана, што мошчы былі перанесеныя ў Кіева-Пячэрскую лаўру. Дні памяці: 28 красавіка і 4 чэрвеня (па юліянскім календары). Сёння у Тураве усталяваны велічны помнік Славнаму сыну гэтага горада і Беларускай зямлі.